

Пейджинговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

№36 (222). 6 — 12 верасня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 170 руб.

НАВІНЫ

НАБЛЮДАТЕЛЕЙ В СЛОНИМЕ НЕ ПУСКАЮТ

Командование воинской части в Слониме не собирается пускать на избирательный участок независимых наблюдателей.

Жительница Слонима Светлана Валерьянова обратилась в Центризбирком и прокуратуру за разъяснениями. В качестве наблюдателя от общественной организации она направлена на избирательный участок №23 "Паўднёвы", расположенный на территории воинской части 33933. Командование части — полковник В.Лихолап пояснил, что наблюдатель может присутствовать на участке только с разрешения начальника главного штаба вооруженных сил С.Грулева.

По мнению Михаила Плиско, юриста предвыборного штаба: "Требование командования воинской части не соответствует законодательству. В постановлении ЦИК от 8 июня такого нет". Интересно, что по этому поводу ответит Светлане Валерьяновой сам ЦИК?

Наталья ФУРСОВА

НАЧАЛИСЬ УЧЕБНЫЕ БУДНИ

1 сентября начался новый учебный год для полутора миллионов учащихся Беларуси.

Как сообщил БелаПАН заместитель начальника главного управления общего среднего образования Министерства образования Борис Гапанович, занятия начались в более чем четырех с половиной тысячах школ. В 60 с лишним процентах школ преподавание всех предметов ведется на белорусском языке.

В новом учебном году около 105 тысяч детей впервые садятся за парты в подготовительных классах; более 150 тысяч подростков закончат 9-й класс и порядка 90 тысяч юношей и девушек завершат обучение в 11-м классе общеобразовательной средней школы.

Марат ГОРЕВОЙ

ПРОГНОЗ по Гродненской области ПОГОДЫ

6-7 СЕНТЯБРЯ по Гродненской области облачно с прояснениями. Временами дождь, в отдельных районах — гроза.

Ветер неустойчивый 3-7 м/с, при грозе порывы до 14 м/с.

Температура воздуха ночью +9+14, днем +14+19.

Облгидрометеоцентр

УЛАДЗІМІР ГАНЧАРЫК СУСТРЭЎСЯ СА СЛОНІМСКІМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ



Фота Віталя Гіля

У пятніцу, 31 жніўня, кандыдат у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ганчарык сустрэўся са слонімскімі выбаршчыкамі. Найперш, сустрэча планавалася адбыцца ў актавай зале СШ №3 г.Слоніма, але яе перанеслі на пляцоўку перад школай. Слонімцаў прыйшло шмат, і ў школьнай зале наўрад ці ўсім хапіла б месца. Сярод прысутных былі таксама і прадстаўнікі мясцовай улады, супрацоўнікі КДБ, міліцыі і іншая зацікаўленая публіка. Што ж, і ім не пашкодзіла сустрэча з кандыдатам у прэзідэнты, а можа, наадварот, прынесла карысць.

Разам з Уладзімірам Ганчарыкам у Слонім завітаў і былы прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Чыгір.

(Працяг на 2, 3 стар.)

ОПРОС

ОНИ СДЕЛАЛИ СВОЙ ВЫБОР

9 сентября в нашей стране – выборы президента. В связи с этим корреспонденты "ГС" обратились к слонимчанам с вопросом, пойдут ли они на выборы и за кого будут голосовать?

Левкевич Татьяна:
— На выборы я пойду. Но пока что я не решила, за кого буду голосовать.

Магер Виталий Николаевич:
— Нет, я не пойду на выборы. Просто я не вижу достойной кандидатуры в президенты, за кого я бы мог отдать свой голос.

Блоха Юрий:
— Я собираюсь пойти на выборы. А голосовать буду за Гончарика, просто мне нравится его предвыборная программа.

Демьянов Олег:
— Я обязательно пойду на выборы. И, скорее всего, буду голосовать против Лукашенко.

Нестер Наталья:
— Конечно же, я пойду проголосовать. Пока что я не знаю, кому отдам свой голос.

Светлана Ивановна:
— Да, я пойду на выборы. Я буду голосовать против Александра Лукашенко.

Ольга ШИНКЕВИЧ, Виталий ГИЛЬ (фото)

ПОШТА

ЛІФТЫ БЕЗ ГРОШАЙ НЕ ПРАЦУЮЦЬ

У рэдакцыю нашай газеты пазванілі жыхары дома № 51 з Брэсцкай вуліцы і паскардзіліся, што ўжо месяц, як у іх доме не працуе ліфт.

Пракаменціраваць сітуацыю карэспандэнт "ГС" папрасіў начальніка слонімскага ўчастка "Белліфтспецмантаж" Мікалая Балкунца. Ён сказаў, што ў доме № 51 трэба тэрмінова замяніць канаты, а яшчэ ў адным са шматпавярховых дамоў неабходна памяняць рухавік. На ўсё гэта трэба выдаткаваць з мясцовага бюджэту каля 2 мільёнаў рублёў. А такую суму гарвыканкам нам не пералічвае. Як толькі паступяць грошы, адразу і будуць працаваць ліфты. Калі гэта будзе — цяжка сказаць. На нашым участку на сённяшні дзень ёсць нават запазычанасць па зарплаце, — сказаў Мікалай Балкунец.

Сяргей ЧЫГРЫН

СКІДКА ТОЛЬКІ ІНВАЛІДАМ

"Паважаная рэдакцыя "Газеты Слонімскай".

З'яўляюся вашым падпісчыкам і вельмі прашу вас даць адказ на пытанне, каму прадастаўляюцца ільготы пры аплаце паслуг за газ, тэлефон, ваду і электраэнергію. Бо ведаю сям'ю пенсіянераў, якія маюць 50-працэнтную скідку на ўсе гэтыя паслугі.

З павагай, Рэус."

Па інфармацыю аб льготах для пенсіянераў карэспандэнт "ГС" звярнуўся ў аддзел сацыяльнай абароны Слонімскага гарвыканкама. Інспектар па быту гэтага аддзела Любоў Дзюбенка, адзначыла, што скідкі, льготы на аплату за камунальныя паслугі існуючым заканадаўствам прадугледжаны толькі для інвалідаў І, ІІ груп. Разлік гэтых скідак робіць у домакіраўніцтве, але толькі ў тым выпадку, калі інвалід пражывае асобна ад працаздольных членаў сям'і.

У такім жа парадку разлічваецца і скідка ў 50% на аплату за карыстанне тэлефонам (акрамя міжнародных і міжгародніх размоў).

Валерый КАВАЛЕНКА

МИЛИЦИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАЛАСЬ ПРЕЗЕРВАТИВАМИ

В прошедшее воскресенье, 2 сентября, в магазине "Лилия" работники слонимской милиции задержали сотрудника "Газеты Слонімскай" Алексея Горяйнова. Вместе с ним в отдел был доставлен и его приятель, слонимец Александр Жуковский.

Молодых людей обвинили в том, что они, якобы, причастны к расклеиванию предвыборных наклеек. В результате обыска у ребят, действительно, обнаружили несколько наклеек, календариков и... 36 презервативов. Эти вещдоки и стали основанием для состава административного нарушения. Что самое интересное, в протоколах было зафиксировано, что Горяйнов и Жуковский разместили порочащую (правда непонятно, кого имелось в виду **В.В.**) наклейку на столбе около магазина "Юбилейный" в 13.50. Но как они могли это сделать, когда в это время ребята находились в отделе и беседовали с милиционерами?..

Эта история даёт основание считать, что Слонимский отдел получил сверху директиву найти и наказать расклейщиков всякого рода пропагандистских прокламаций, связанных с выборами президента. Да, к тому же в тот день город посетил таинственный большой милицейский чин, который и координировал работу по отлову "нарушителей".

Похоже на то, что ребята попались под руку, и на них в спешном порядке стряпали дело для отчётности.

Оно понятно, когда людей задержали с поличным. Да, в этом случае они должны понести наказание за порчу фасада здания или столба. Но зачем было составлять протокол, глядя в потолок? Неужели уголовному розыску, а именно сотрудники этого отделения, которые провели вышеназванную операцию, больше нечем заниматься? Да и какое ко всему этому имеют отношение презервативы? Хотя, понятно, отдел большой. Но на всех всё равно не хватит.

Виктор ВОЛОДАЩУК

У ЛУКАШЕНКО БОЛЬШИЕ РЫЧАГИ

Посол Беларуси в Соединенных Штатах Америки Валерий Цепкало признал, что Александр Лукашенко "обладает большими рычагами влияния", нежели его соперники — Владимир Гончарик и Сергей Гайдукевич, сообщает корреспондент "Интерфакса" из Вашингтона.

И это, по словам дипломата, можно считать преимуществом действующего главы государства на предстоящих президентских выборах.

Белорусский посол выступил с этим заявлением на пресс-конференции в Вашингтоне после того, как ранее Государственный департамент США выразил сомнения относительно справедливого характера будущих выборов. При этом В.Цепкало признал, что "не следует относиться к этим выборам как к абсолютно справедливым". Он добавил, что А.Лукашенко, занимающему президентский пост, естественно, со стороны СМИ уделяется больше внимания, чем его соперникам, но это свойственно не только Беларуси.

БелаПАН

УЛАДЗІМІР ГАНЧАРЫК СУСТРЭЎСЯ СА СЛОНІМСКІМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ

(Працяг. Пачатак на 1 стар.)

Сваю сустрэчу Уладзімір Ганчарык пачаў з выступлення. Ён, у прыватнасці, сказаў:

— Я ўпэўнены, што беларусы павінны жыць значна лепш, чым мы жывем сёння. У мяне пытаюцца выбаршчыкі, чаму я не абяцаю ім столькі і столькі даляраў? Вось, напрыклад, Лукашэнка паабяцаў усім зарплату ў 100 даляраў, але пакуль не выканаў сваё абяцанне. У канцы пяцігодкі абяцае 250 даляраў. Гайдукевіч плануе даць усім нам па 300-400 даляраў, а вось Ганчарык нікому нічога не абяцае. Так, я не абяцаю. Але я хачу стварыць умовы, каб беларусы зараблялі столькі, колькі яны хочуць і змогуць. Мы павінны вучыцца не на сваіх памылках, а на волыце іншых дзяржаў. Гэта першае.


Слонімцы слухаюць выступленне Уладзіміра Ганчарыка

Фота Віталя ГІЛЯ

Другое, нам прыйдзецца выбіраць паміж хамствам, махлярствам, якія становяцца дзяржаўнай палітыкай і ідэалогіяй, і шчырай палітыкай.

І трэцяе. Я не прымаю крайнасцей. Я ненавіджу фашызм, я не магу любіць і паважаць чалавека, які захапляецца гітлераўскім парадкам. Я не ўспрымаю крайні нацыяналізм, што вось Беларусь — для беларусаў. Не можа так быць. Беларусь для тых людзей, якія тут жывуць, імя якім — беларускі народ. Не трэба раз'ядноўваць людзей на "чэсных" і "нячэсных", на патрыётаў і здраднікаў, прытым у наш мірны час.

Я не магу зразумець, не магу ўцяміць, што ў Беларусі сёння знішчаюць людзей, якія нягодныя сённяшняй уладзе. Калі я аддаў прэзідэнту дакументы наконт знікнення Захаранкі, Ганчара, Красоўскага, я прасіў яго толькі аб адным — праверыць факты. Таму што там ёсць прозвішчы, ёсць рапарты генерал-маёра Лапаціка, палкоўніка Алкаева, іх допыты, ёсць журнал, дзе запісана выдача пісталета. Усё там было. Ад прэзідэнта мы ўсе пачулі адказ: "Гэта мітусня, смецце. Усё гэта няпраўда, глупства" і г.д. Жыццё людзей — глупства?..

А сёння чытаю ў газетах, што міністр унутраных спраў Навумаў прызнае: так, рапарт Лапаціка быў. Пазваніў Алег Алкаеў і сказаў: "Так, я напісаў гэты рапарт, у мяне ёсць журнал, ёсць сведкі". Павел Шарамет паведаміў у прэсе, што ёсць запіс інтэрв'ю з Алкаевым на расійскім тэлебачанні, але яго не пускаюць у эфір, бо Лукашэнка звязаўся з расійскім кіраўніцтвам і прасіў не даваць.

Вось такой палітыкі ў мірны час не будзе. І распараджацца лёсам людзей таксама нікому не дазволім. Такога 37-га года мы не дапусцім,— сказаў Уладзімір Ганчарык.

— Што датычыцца эканомікі, — працягваў у сваім выступленні кандыдат у прэзідэнты,— дык трэба тэрмінова здымаць тыя абмежаванні, якія перашкаджаюць выпускаць не проста прадукцыю, якая сёння ляжыць на складах, а канкурэнтаздольную прадукцыю. Мы пацяху зыходзім з расійскага рынку, хаця там — наш гандаль. Мы ўжо згубілі мэблевую, тэкстыльную прадукцыю, не можам ёю канкураваць. Нашы прадукты харчавання цяпер даражэйшыя за расійскія, а іх мы прадавалі ў Маскве.

Чаму Расія закупіла сёння польскую бульбу, а не нашу? Таму, што ў нас яна дарагая. У нас — старая вытворчасць. Мы павінны зрабіць так, как атрымаць інвестыцыі, а не палохаць, што нас купяць амерыканцы і г.д. Ім не патрэбны нашы заводы... Адно скажу, што будаваць палацы, як Лукашэнка, мы не будзем. За гэтыя грошы мы лепш купім лекі для бальніц.

— Я і мая каманда абяцаем толькі шчырую палітыку,— сказаў Уладзімір Ганчарык. — Гэта значыць, што мы ўсё ж праверым, што гэта за прэзідэнцкія фонды, якія нідзе не ўлічаны. Што гэта за размовы пра мільёны даляраў? Дзе грошы ад прададзенай зброі, якою гандлюе Шэйман?.. Дзе грошы, якія ўкладваў Іван Ціцянкоў?.. Яны павінны быць у адным дзяржаўным бюджэце, а не ў двух. Я не магу зразумець тое, што сказаў Лукашэнка: "Былы пракурор Беларусі Бажэлка і былы ўпраўляючы справамі прэзідэнта Ціцянкоў укралі 42 мільёны даляраў". І сёння Бажэлка вольна ходзіць па Мінску, ніхто яго не арыштоўвае. Бо Бажэлка ведае ўсю праўду пра людзей, якія зніклі, і маўчыць...

Далей у сваім выступленні Уладзімір Ганчарык спыніўся на ўмацаванні дзяржаўнай сістэмы кіравання. Па ягоным меркаванні неабходна пашырыць правы і паўнамоцтвы парламента, урада, органаў мясцовага самакіравання. Старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў павінны выбіраць людзі, а не прызначаць прэзідэнт, каб яны адчувалі адказнасць перад народам за сваю працу,— сказаў Уладзімір Ганчарык.

На сустрэчы ў Слоніме кандыдат у прэзідэнты гаварыў перад сваімі выбаршчыкамі пра дзяржаўную мову, суд, пра гісторыю Беларусі, пра калгасы і пра эканамічныя стасункі з Расіяй і з іншымі краінамі-суседзямі, пра міліцыю і армію. А Лукашэнку Ганчарык паабяцаў падараваць адзін з БТРаў, на якім той ездзіў на вучэннях "Нёман-2001".

Звярнуў увагу Уладзімір Ганчарык і на асуджаных людзей, якія сядзяць у турмах. Ён сказаў, што сёння Беларусь займае трэцяе месца ў свеце па ліку асуджаных на 100 тысяч чалавек.

(Заканчэнне на 3 стар.)

навіны

"ВЫБІРАЙ" – ВЕЛАПРАБЕГ

2 верасня сланімчане маглі пабачыць нешта не зусім звыклае для нашага горада. Дзесяць юнакоў і дзяўчат на веласіпедах, упрыгожаных рознакаляровымі шарамі з надпісамі "Выбірай 09.09.2001г." і "Я люблю Беларусь", правялі велапрабег па вуліцах Слоніма.

Велапрабег праводзіўся ў рамках мабілізацыйнай кампаніі "Выбірай". Сваёй мэтай удзельнікі акцыі ставілі ўзбудзіць грамадзянскую свядомасць сланімчан, пераканаць іх у неабходнасці прыйсці 9 верасня на выбарчыя ўчасткі і зрабіць свой выбар. Незвычайны падыход да справы выклікаў зацікаўленасць людзей, і яны ахвотна бралі розныя друкаваныя матэрыялы па тэме выбараў, што раздавалі ўдзельнікі велапрабегу пад час кароткіх прыпынкаў.


Удзельнікі велапрабегу на Брэсцкай вуліцы

Фота Віталя ГІЛЯ

Да ўдзелу ў акцыі не былі зачынены дзверы ні для каго з жадаючых. Так, напрыклад, каля аўтобуснага парку да велапрабегу далучыўся хлопчык, які проста праязджаў міма. Велапрабег быў добра арганізаваны і прайшоў без здарэнняў на дарозе. Але ж мясцовыя ўлады ўсё ж такі не ўтрымаліся, каб не ўсунуць сваю лыжку дзёгцю ў чыюсці бочку мёду.

Калі ланцужок веласіпедыстаў ехаў па вуліцы Пушкіна каля стадыёна, на шляху паўсталі супрацоўнікі ДАІ. Дарэчы, веласіпедыстаў яны хуценька прапусцілі, папярэдне правёўшы "лікбез" па правілам дарожнага руху. А вось машыну суправаджэння міліцыянеры затрымалі і прапанавалі вадзіцелю Віталю Ешану і пасажырам, карэспандэнтам "ГС", праехаць для дагляду ў аддзел міліцыі.

Вобыск машыны, дарэчы, праводзіў начальнік крымінальнага вышуку Слонімскага ГРАУС Сяргей Мароз і яшчэ нейкі чын у цывільным з вобласці. Каля двюх гадзін яны спрабавалі знайсці якую-небудзь зачэпку ў выяўленых у машыне некалькіх экземплярах прадвыбарнай праграмы Уладзіміра Ганчарыка. Але не ўбачыўшы ніякай крамолы, акрамя адсутнасці выходных дадзеных на ўлётках, затрыманых адпусцілі з мірам.

А тым часам самыя ўдзельнікі велапрабегу паспяхова фінішыравалі каля краязнаўчага музея. Падобныя акцыі яны мяркуюць правесці ў Слонімскім, Зэльвенскім і Дзятлаўскім раёнах.

Валерый КАВАЛЕНКА

9 верасня ВЫБАРЫ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

"ВОЛЯ ДА РАЗВІЦЦЯ" БУДЗЕ НАЗІРАЦЬ ЗА ВЫБАРАМІ

1 верасня ў Слоніме адбыўся семінар для сябраў грамадскага аб'яднання "Воля да развіцця", якія будуць у якасці назіральнікаў ажыццяўляць кантроль за выбарамі Прэзідэнта Беларусі.

Як паведаміў кіраўнік аб'яднання Міхась Варанец, назіральнікі ад "Волі да развіцця" будуць прысутнічаць на 15 выбарчых участках Слоніма і Слонімскага раёна і на большасці ўчасткаў Зэльвенскага і Дзятлаўскага раёнаў. Міхась Варанец адзначыў, што хаця ўчастковыя камісіі і сфарміраваны ўладамі, але ў складзе іх — нармальныя добрасумленныя людзі. Таму задача назіральнікаў найперш у тым, каб дапамагчы ўчастковым камісіям вытрымаць неймаверны ціск з боку "вертыкалі" і правесці сапраўды адкрытыя, чэсныя і свабодныя выбары.

Алесь ЦІШКЕВІЧ

НАВІНЫ

"КУЛЬТУРА" — НА ЯБЛЫКАХ

Напярэдадні верасня работнікі аддзела культуры Мастоўскага райвыканкама былі накіраваны на збор яблыкаў.

Пачэсны свой абавязак яны адбывалі ў саўгасе "Чарлёна".

ПАЦЯРПЕЛА ЗА ПРЭЗІДЭНТА

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў беларускі электарат выказвае сваю падтрымку таму ці іншаму кандыдату. Іншы раз гэта прыводзіць да канфлікту.

Дзіўны выпадак адбыўся ў дызель-цягніку Гродна–Ліда. Адна пасажырка-пенсіянерка заявіла галосна сваю падтрымку дзеючаму прэзідэнту. Дзве кабеты яе ўзросту, што ехалі разам, не падзялілі такой думкі ды сталі біць жанчыну гаспадарчымі сумкамі па галаве. Канфліктуючых разнялі пасажыры. Пацярпеўшая за любоў да Лукашэнкі ў міліцыю ды лякарню не звярталася.

Антон МАКЕЙ

ЦІ БУДЗЕ НОВЫ ПАДПОЛЬШЧЫК?

Даўно скончылася вайна, але і па сённяшні дзень выяўляюцца яе ўдзельнікі.

Былы дырэктар Луненскай СШ Мсціслаў Сямак сабраў неабходныя дакументы і звярнуўся ў адпаведныя інстанцыі з просьбаю прызнаць яго падпольшчыкам. Згодна прадстаўленых дакументаў, ураджэнец Слонімскага раёна Сямак у маладыя гады ўдзельнічаў у супраціве нямецкім акупантам і пабываў за гэта ў слонімскай турме.

Антон МАКЕЙ

ЛУКАШЕНКО — ИХ ПРЕЗИДЕНТ

Брошюры с названием "Лукашенко — наш президент" появились на прошлой неделе в библиотеках Слонима.

С цветным фото Александра Лукашенко на обложке, книжицы отпечатаны на великолепной бумаге, но... без каких-либо сведений, где, по чьему заказу, в скольких экземплярах их выдали в свет. О заказчике этих агиток можно, впрочем, и догадаться – руководство местного штаба кандидата Лукашенко. Но если сторонники "батьки" в открытую нарушают Закон (в данном случае – о печати), как можно доверять им и их лидеру?

Анатолий Белянин, кстати, на прошедшей недавно встрече с Владимиром Гончариком, поспешил откреститься от брошюры "Лукашенко – наш президент". Он, мол, ничего о них не знает. И на следующий день все книжицы в срочном порядке были из библиотек изъяты.

Такая вот политика, когда сторонники действующего президента могут делать все, что угодно для достижения целей верхушки "вертикали", а оппоненты загоняются в угол неравными условиями проведения агитации. Так, плакаты кандидата в президенты Беларуси Владимира Гончарика, вывешенные в магазинах "Салют" и "Одежда" в центре Слонима, были сорваны, не провисев и двух дней. Кому это надо, и кто это сделал, заведующие этих магазинов корреспонденту "ГС" объяснить не смогли.

Валерий КОВАЛЕНКО

"ВЕРТЫКАЛЬ" ЖЫРУЕ, А НАРОД МАЎЧЫЦЬ І ГАЛАСУЕ

Каму сёння весела і прывольна жывецца ў Беларусі? На маю думку — "вертыкальшчыку". Бо яму ўсё можна, яму ўсё даступна.

Для пераканаўчасці прывяду некалькі прыкладаў. Пачатак 1995 года. Старшынёй Зэльвенскага райвыканкама прэзідэнтам прызначаны Віктар Будрэвіч, які быў да гэтага кіраўніком калгаса "Зорка" гэтага ж раёна. Стаў раённым "вертыкальшчыкам" і адразу апынуўся... бяздомным. А раз так, дык па вуліцы Шапавалава, 35 у Зэльве адбудавалі для яго, пад выглядам рамонту, так званы "службовы" асабняк. Але праз пэўны час, не дачакаўшыся пенсіі, Будрэвіч страціў пасаду. Тым не менш, у асабняку жыць застаўся. Так сказаць, прыжыўся. 3 лютага 2000 года на пасаду старшыні выканкама пасадзілі Леаніда Эльяшэвіча, які да гэтага падымаў калгас імя Леніна Шчучынскага раёна. Зноў паўстала пытанне аб стварэнні новага старшынскага "службовага" асабняка. Цяпер ужо – для Л.У.Эльяшэвіча.. Хаця, як першы так і другі мелі катэджы па месцы сваёй ранейшай працы. Аднак ні аднаму з іх не сказалі – прадай там, а тут – купі. Не захацелі сказаць – пасаромеліся. Вырашылі адбудаваць і для Л.У.Эльяшэвіча – абы быў "вертыкальшчыкам". Купілі ў грамадзянкі Хворык Веры Іванаўны (жонкі былога начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Хворыка Ф.І.) дом па вуліцы 17 Верасня, 57. Дык і сапраўды, навошта ёй дом у Зэльве, калі ў Гродне ёсць кватэра, прытым немалая. "Адрэзалі" ёй з дзяржаўнага бюджэта нечуваны вялікі "кавалак" грошай. І вось 17 верасня 2000 года В.І.Хворык пакінула асабняк, а 18 верасня 2000 года Л.У.Эльяшэвіч з'явіўся ў ім і стаў прыкідваць, як адбудоўваць харомы. Адбудоўвалі амаль год. Заказчыкам быў Зэльвенскі райвыканкам, а падрадчыкам – адна са слонімскіх фірмаў. У колькі абышоўся падаткаплацельшчыкам асабняк для Л.У.Эльяшэвіча, трымаецца ў вялікім сакрэце. І ўсё ж я паспрабаваў хоць штосьці высветліць. Бо з 10 жніўня 2001 года Л.У.Эльяшэвіч нібыта распачаў усяляцца ў асабняк.

Нагадаю, што дом па вуліцы 17 Верасня, 57 калісьці належаў мясцоваму камунгасу: жылая плошча 51 кв.м і агульная плошча 72 кв.м. У ім у свой час, як я ўзгадваў, жыў Хворык Фёдар Іосіфавіч. На час прыватызацыі ў 1992 годдзе ацэначны кошт дома склаў 17 752 рублі. Хворык Ф.І. заплаціў палавінную суму з нагоды ільготнасці. Пасля, адпаведна 21 ліпеня 1995, ён падарыў дадзены дом цешчы – Салавей Марыі Мікалаеўне. І вось на час дарэння ўзрасла яго жылая і агульная плошча. Яна ўжо складала, адпаведна, 104,8 м² і 144,6 м². А з 29 студзеня 1999 года гэты дом уступіў у спадчыну ад Салавей М.М. да яе дачкі Хворык В.І. А калі Хворыкі падарылі дом цешчы, дык і яны адразу сталі бяздомнымі. У сувязі з гэтым ім, бедалагам, далі кватэру па вул. Горкага ў горадзе Гродне. А тут, як гаворыцца, "падвярнуўся" Л.У.Эльяшэвіч з ... праблемай адсутнасці жылля на Зэльвеншчыне. І як мне паведаміў сам Л.У.Эльяшэвіч, каб не будаваць новы асабняк для яго, яму прапанавалі купіць дом у грамадзянкі Хворык В.І. І ён пагадзіўся. А паколькі Л.У.Эльяшэвіч вельмі любіць зямлю, дык такая зручнасць аказалася для гэтага дома: 0,18 га саду і агароду. У лютым 1994 года Хворык Ф.І. набыў зямлю ўсяго за 1 458 рублёў. А вось на момант афармлення ў спадчыну яна ўжо каштавала 34.662.540 рублёў. А на 1 чэрвеня 2000 года ацэначны кошт дома з зялёнымі пасадкамі ля яго склаў 15.040.497 рублёў. Не цяжка вызначыць, колькі гэта каштуе ў даляравым вылічэнні.

Але гэта не ўсё. Для аднаўлення катэджа з бюджэту было выдаткавана за працу толькі той самай слонімскай фірме каля 20 мільёнаў рублёў. Акрамя таго, матэрыялы прадстаўляў заказчык, гэта значыцца, Зэльвенскі райвыканкам. Трэба яшчэ ўлічыць, што спадар Эльяшэвіч асабліва не прытрымліваўся праектна-каштарыснай дакументацыі, якая была зацверджана выканкамам, і пастаянна ўносіў свае карэктывы. А гэта значыць – дадатковыя выдаткі з бюджэту. Вось, напрыклад, 1м.кв. акна са шклопакетам каштуе прыкладна 90 тыс. рублёў, а падобныя дзверы – у межах 70 – 120 даляраў. А вось поручні лесвіцы на другі паверх і яе прыступкі з дубу каштуюць таксама немалыя грошы. А кухонная мэбля, тэлевізійныя і тэлефонныя разеткі ў кожным пакоі дома, шыкоўныя люстры і шмат якога іншага дабра. Тая ж ламініраваная падлога паступіла са Скандынавіі праз Польшчу. Здаецца, супрацоўнікам дзяржкантролю ёсць сэнс заглянуць да навасельца Эльяшэвіча і папытаць: навошта трацяцца казённыя грошы не па прызначэнню? А можа так і трэба?

Я спрабаваў даведацца, колькі гэтая адбудова ўвогуле каштуе. На думку аднаго з яе ўдзельнікаў, які прасіў яго не называць, кошт адбудовы перавышае кошт куплі. Атрымліваецца, што "вертыкаль" людскіх грошай не шкадуе.

І як тут не ўспомніць Францішка Багушэвіча, які пісаў: "Адзін ходзіць у саеце... Адзін мае хатаў многа... Аднаму дзесяткі-служкі зарабляюць сотні-сот...", "У другога ў сцяне дзюры, вецер ходзе, дым і снег..." Абрабоўваюць падаткаплацельшчыка чыноўнікі бязбожна. І прыпыніць гэта нахабства сёння няма каму.

Іван ЦІМАФЕЙЧЫК,
жыхар вёскі Мадзейкі
Зэльвенскага раёна

УЛАДЗІМІР ГАНЧАРЫК СУСТРЭЎСЯ СА СЛОНІМСКІМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1, 2 стар.)

Пасля свайго выступлення кандыдат у прэзідэнты адказаў на пытанні сваіх выбаршчыкаў. Яны былі самыя розныя. Задаў тры пытанні і намеснік старшыні Слонімскага гарвыканкама Анатоль Бялянін, які прысутнічаў на сустрэчы.

Анатоль Бялянін:

— Як вы адносіцеся да таго, што маладыя "зубры" сёння размалявалі ўвесь наш Слонім? Хто гэта будзе зафарбоўваць?

Уладзімір Ганчарык:

– Я адношуся адмоўна да размалёўкі дамоў. І прашу гэтага не рабіць. Але давайце мы разам з вамі звернемся да Лукашэнкі, каб ён даў тэлеэфір, з якога дзень і ноч сам не сходзіць. Я выступлю і скажу "зубрам", каб яны ачысцілі ад надпісаў гарады і вёскі. Яны за суткі ўсё зафарбуюць.

Анатоль Бялянін:

— Вы сказалі, што чыноўнікі бяруць хабар. Няхай сёння хоць адзін з прысутных скажа, хто мне даваў хабар?

Уладзімір Ганчарык:

– Я сказаў не так. Я сказаў, чым больш чыноўнікаў – тым больш хабару. Але чаму вы раптам, Анатоль Васільевіч, сталі апраўдвацца, я не ведаю.

Анатоль Бялянін:


— З вашых вуснаў прагучала, што галасы тых, хто прагаласуе датэрмінова, будуць падменены. У выбарчых камісіях у Беларусі сёння працуе 9 тысяч чалавек. Што, яны ўсе нядобрасумленныя людзі?

Уладзімір Ганчарык:

— Вы пагадзіцеся, што гэта антызаконна застаўляць кіраўнікоў усіх рангаў, у тым ліку і старшынь Слонімскіх гарадскога і раённага выканкамаў, каб не менш 30% выбаршчыкаў прагаласавалі датэрмінова. Навошта так рабіць? І што гэта за каманда, каб Лукашэнка ў першым туры набраў 61% галасоў? – адказаў Уладзімір Ганчарык.

Пасля сустрэчы ў Слоніме кандыдат на пасаду кіраўніка дзяржавы адказаў на некалькі пытанняў карэспандэнта "Газеты Слонімскай".

— Уладзімір Іванавіч, як праходзяць на Гродзеншчыне Вашы сустрэчы з выбаршчыкамі?



Намеснік старшыні Слонімскага гарвыканкама Анатоль Бялянін дыскуціруе з адным з выбаршчыкаў

— Гэта вельмі хвалюючыя сустрэчы. Пасля іх людзі больш сталі задумвацца, якая ў нас улада. Выбар ідзе не паміж Ганчарыкам і Лукашэнкам, а паміж справядлівасцю і тым, што мы сёння маем. Трэба пераканаць вяскоўцаў, пенсіянераў, людзей сталага ўзросту ў тым, што не Лукашэнка ім плоціць пенсіі, дае зарплаты, а іх зарабілі самі людзі. І не трэба палохаць жыхароў рэспублікі вайною і НАТА, не трэба ствараць ворагаў сярод сваіх людзей. Аб гэтым і вяду я размовы са сваімі выбаршчыкамі. Звяртаюся да іх з просьбаю, каб не галасавалі яны датэрмінова, бо гэта – фальсіфікацыя.

— Ці спадабалася Вам сустрэча ў Слоніме?

– Так, спадабалася. У гэты дзень мы яшчэ з Міхаілам Чыгіром выступалі ў Гродне і ў Ваўкавыску.

— Ці былі Вы раней у Слоніме?

– Быў, але вельмі даўно.

— Ці будзе ў Вас магчымасць выступіць яшчэ раз на БТ?

– Не, не будзе. Відаць, я яшчэ выступлю на расійскім тэлебачанні.

— Што Вы пажадаеце чытачам "Газеты Слонімскай" і сваім слонімскім выбаршчыкам?

– "Газеце Слонімскай" жадаю, каб у яе было яшчэ больш чытачоў і падпісчыкаў. А ўсім выбаршчыкам – перамогі, таму што ад іх залежыць будучыня нашай краіны, – сказаў Уладзімір Ганчарык.

І на заканчэнне замест пастскрыптума дадам, што як толькі пачаў выступаць кандыдат у прэзідэнты, у СШ №3 і ў суседніх з ёю будынках адключылася электрычнае святло. Яно то загаралася, то зноў патухала. Так працягвалася аж да таго часу, пакуль Уладзімір Ганчарык не пакінуў Слонім.

Сяргей ЧЫГРЫН

ТАРИФЫ НА КОММУНАЛЬНЫЕ УСЛУГИ ВЫРОСЛИ

В августе нынешнего года вновь увеличились тарифы на жилищно-коммунальные услуги для населения.

На 1,7 процента увеличилась квартплата (техобслуживание) и плата за пользование лифтом, на столько же подорожали газ, горячая и холодная вода, канализация, вывоз и обезвреживание отходов.

Ставка квартплаты (техобслуживания), единая для всей республики, выросла с 10,67 до 10,85 рубля за квадратный метр общей площади.

С начала года плата за пользование лифтом возросла на 27,7 процента, квартплата (техобслуживание) — на 27,8, плата за пользование радиоточкой — на 32,4, холодная вода и канализация — на 61,2, газ — на 67,4, вывоз отходов — на 79,5, обезвреживание отходов — на 80,1 процента, горячая вода — в 2,24 раза.

БелаПАН

НА РАБОТУ СЛУЖАЩИЕ БУДУТ ЕЗДИТЬ БЕСПЛАТНО

Гродненский облисполком принял решение о компенсации работникам учреждений образования, здравоохранения, культуры и социальной сферы стоимости проезда до места работы и обратно: 50 процентов — с 1 сентября этого года и 100 процентов — с 1 января 2002 года.

На эти льготы имеют право специалисты, проживающие в городской и приравненной к ней местности и работающие в учреждениях, находящихся в сельской местности.

Решение исполкома носит название "О социальной поддержке специалистов учреждений социально-культурной сферы". Расходы по компенсации работникам стоимости проезда в этом году будут осуществляться из средств областного и районных бюджетов. В 2002 году власти намерены учесть эти расходы в бюджете области на 2002 год.

Павел МОЖЕЙКО

БЕСПЛАТНЫЙ ПРОЕЗД ДЛЯ СТУДЕНТОВ

Президент подписал указ "О предоставлении отдельным категориям граждан права на бесплатный проезд по территории Республики Беларусь".

Согласно указу, с 1 по 30 сентября нынешнего года студентам высших учебных заведений и учащимся средних специальных учебных заведений и профессионально-технических училищ дневной формы обучения предоставлено право бесплатного поезда на автобусах регулярных пригородных и междугородных маршрутов, на пригородных поездах, в общих и плацкартных вагонах поездов внутриреспубликанского сообщения по пятницам, субботам, воскресеньям и понедельникам.

Как отмечается в официальном комментарии к указу, цель его принятия — "создание условий для оказания помощи в уборке урожая 2001 года", поскольку многие студенты и учащиеся, прежде всего из сельской местности, "будут совмещать учебу с оказанием по выходным дням помощи родителям и родственникам в уборке урожая и проведении других сельскохозяйственных работ".

Наталья КУЛАГИНА

БЕЛОРУССКИЕ ЗАВОДЫ – В ОБМЕН НА ПОБЕДУ

По политическим мотивам Общественное российское телевидение и некоторые другие российские телеканалы ограничили освещение событий в Беларуси.

Об этом заявил руководитель отдела специальных информационных проектов ОРТ Павел Шеремет на заседании пресс-клуба Белорусской ассоциации журналистов, состоявшегося недавно в Минске. В частности, по его словам, ОРТ располагает полным вариантом записи интервью бывшего начальника следственного изолятора Олега Алкаева, которое в весьма сокращенном виде было опубликовано в негосударственных белорусских газетах.


Фота IREX/ProMedia

Павел Шеремет

Это интервью взяли у Алкаева журналисты Общественного российского телевидения в Берлине. Оно было подготовлено для показа на телеканале. Однако, по словам Шеремета, "в результате личного вмешательства президента Лукашенко и его общения с руководством Российской Федерации, пока мы не можем показать пленку Алкаева. Насколько я знаю, точно такие же проблемы возникли на НТВ, — сказал он. — Я не хочу скрывать, что у нас сейчас по политическим соображениям есть серьезные проблемы с показом того, что мы в ходе собственных поисков обнаруживаем. Поэтому мы достаточно интенсивно делимся своими материалами со всеми средствами массовой информации. Но, к сожалению, политика сейчас превалирует... Я бы показал все, что можно. Но, к сожалению, это решается значительно выше".

"Мы держим паузу и потому, что у меня нет сомнений в победе Лукашенко на выборах. Даже если он фактически не победит на выборах, формально он победит. Результаты выборов будут сфальсифицированы. Но этот выбор будет признан Россией. И потому обнародование части имеющихся фактов гораздо важнее будет после выборов, чем сейчас", — отметил Шеремет.

По мнению Шеремета, так называемая победа Лукашенко в результате тотальной фальсификации будет являться лишь эпизодом агонии, которую переживает его режим. "К моему страшному сожалению, Россия не принимает никакого участия в этих выборах, поскольку Лукашенко предложил формулу: "белорусские заводы — в обмен на победу". Но ситуация и для него очень плоха. Так как никаких заводов в обмен на поддержку российские олигархи в очередной раз не получат, поскольку Лукашенко их обманет, вот тогда Россия заявит свою четкую и ясную позицию. Потому я считаю, что уже сейчас нужно думать о том, что предпринимать после выборов", — сказал Шеремет.

Геннадий БАРБАРИЧ

НОВЫЕ ВЕРСИИ ОБ ИСЧЕЗНОВЕНИИ ЗАВАДСКОГО

В ходе состоявшегося в Минске на прошлой неделе заседания пресс-клуба руководитель отдела специальных информационных проектов Общественного российского телевидения Павел Шеремет рассказал об одной из версий исчезновения Дмитрия Завадского.


Фота IREX/ProMedia

Дмитрий Завадский (слева) и Павел Шеремет (справа)

О ней журналисту стало известно после нескольких встреч Павла Шеремета с бывшим генеральным прокурором Республики Беларусь Олегом Божелко, а также из других источников.

Версия связана с "чеченским следом" и участием белорусских спецслужб в тех событиях, которые происходят в Чечне. "В частности, речь идет о подозрениях, что кто-то из руководителей белорусского государства занимался поставкой стрелкового оружия через Турцию и Грузию боевикам в Чечню, — сказал Шеремет. — Для этого использовались сотрудники белорусских спецподразделений, которые воевали то в российской армии, то на стороне боевиков. Поэтому, когда Завадский рассказал в интервью, что были задержаны белорусские спецназовцы, по версии следователей белорусской прокуратуры, это стало толчком для того, чтобы его похитить, с целью узнать у него подробности, знает он об этих операциях что-либо или нет", — сказал Шеремет. По его информации, подозреваемые в похищении Завадского, после задержания начали давать показания. Но, когда "критическая масса" материалов стала опасной для власти, следствие было остановлено. С задержанными провели уже другую работу, после чего они — бывший офицер спецподразделения МВД "Алмаз" Валерий Игнатович и бывший курсант академии милиции Алексей Гуз —перестали давать показания вообще.

Не исключает Шеремет, что Игнатович мог отомстить и за интервью Завадского, где он рассказал о его задержании в Чечне. Но, по мнению журналиста, Игнатович и трое других обвиняемых не могли провести такую сложную операцию, как похищение Завадского. Тем более обвинение в похищении Завадского предъявлено только Игнатовичу и еще одному проходящему по этому делу.

О связи Игнатовича с некими спецслужбами говорит и еще один эпизод. Когда Игнатович и еще 3 человека в июле 2000 года ехали в Чечню, то были задержаны на посту ГАИ в Краснодарском крае. Они требовали вызвать кого-нибудь из местного ФСБ. Вскоре из краевого управления ФСБ приехал человек, представил необходимые документы и освободил всех задержанных. После начала расследования белорусские следователи попытались найти этого сотрудника спецслужб. Направили необходимые официальные запросы в ФСБ, ГАИ. Но безрезультатно.

Как рассказал Шеремет, руководство и журналисты ОРТ продолжают поиски Дмитрия Завадского. Регулярно направляют властям Беларуси запросы, получая на них отписки. ОРТ настаивает на присутствии своего представителя на суде по уголовному делу Игнатовича и других членов группы, обвиняемых в ряде преступлений, в том числе в похищении Дмитрия Завадского.

Геннадий БАРБАРИЧ

РАСІЙСКАЯ ПРЭСА ЎСЁ БОЛЬШ СКЕПТЫЧНА ПІША ПРА ЛУКАШЭНКУ

Ці падтрымлівае Крэмль Лукашэнку на прэзідэнцкіх выбарах? — гэтае пытанне прэвалюе ў свежых публікацыях расійскай прэсы.

Газета "Московская правда" у артыкуле "Бацька — лішні" звяртае ўвагу, што ў Кіеў, дзе ва ўрачыстасцях з нагоды 10-х угодкаў незалежнасці Украіны бралі ўдзел прэзідэнты Расіі, Польшчы і Македоніі, не быў запрошаны Аляксандр Лукашэнка. Газета лічыць, што "для Аляксандра Рыгоравіча гэта — дрэнны знак. Вельмі дрэнны."

Цытуючы святочную прамову Пуціна, у якой прэзідэнт Расіі рабіў заявы накшталт "Будучыня Расіі і Украіны — гэта будучыня дзвюх еўрапейскіх дзяржаў" і, падкрэсліваючы, што візіт расійскага прэзідэнта ў Кіеў — чацвертая за апошні месяц сустрэча Леаніда Кучмы і Уладзіміра Пуціна, газета робіць выснову: гэта "можна лічыць эпітафіяй на надмагільным камяні расійска-беларускага сяброўства. Прынамсі, у тым экстрэмальным выглядзе — заўтра як аб'яднаемся! — што найбольш імпанаваў афіцыйнаму Мінску".

Так піша "Московская правда" і дадае: "Пуцін стаміўся любіць аўтсайдэра Лукашэнку, цяпер мы будзем сябраваць з нармальнай дэмакратычнай дзяржавай — Украінай. Лукашэнка вельмі хацеў атрымаць знак з Масквы з нагоды вераснёўскіх выбараў. Ён яго атрымаў". Шанцы на вераснёўскіх выбарах беларускай апазіцыі, якая вылучыла адзіным кандыдатам у прэзідэнты Уладзіміра Ганчарыка, аналізуе газета "Коммерсант-Власть". Вось высновa, да якой прыходзіць аўтарытэтнае расійскае выданне: "Нават калі Лукашэнка і здолее, абапіраючыся на моц дзяржаўнай машыны, забяспечыць выгодныя для сябе вынікі галасавання, будучыя выбары ў любым выпадку стануць ягонай паразай. Ад непрадказальнага беларускага лідэра ўжо адвярнулася значная частка наменклатуры. Насельніцтва ўжо бачыць, што ў прэзідэнта, які яшчэ ўчора падаваўся нязменным, ёсць разумная альтэрнатыва. Лукашэнка не будзе больш "усенародным бацькам". А таму, у выпадку ягонага пераабрання на пост кіраўніка дзяржавы, наступныя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі адбудуцца хутчэй за ўсё не праз пяць гадоў, а нашмат раней — няўдалая ў 1996 годзе спроба апазіцыі арганізаваць імпічмэнт цалкам можа атрымацца зараз."

Такую версію магчымага развіцця падзей у Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў выкладае аналітык расійскай газеты "Коммерсант-Власть" Генадзь Сысоеў. У гэтым жа артыкуле разглядаецца і афіцыйная пазіцыя Масквы адносна беларускіх выбараў. Канстатуючы, што Крэмль заняў пазіцыю чакання, не падтрымаўшы адкрыта Лукашэнку і не зрабіўшы кроку ў бок падтрымкі апазіцыі, "Коммерсант-Власть" выказвае сваё меркаванне:

"У выхадзе адыёнага саюзніка павінна быць зацікаўлена Расія..., і Расія павінна паспяшацца. Згодна з праведзенымі ў Беларусі апытаннямі, пачынаючы з 1996 года, там назіраецца ўстойлівы рост антырасійскіх настрояў. Палітолагі тлумачаць гэта тым, што многія беларусы, незадаволеныя рэжымам Лукашэнкі, звязваюць захаванне ім сваёй аўтарытарнай улады з падтрымкай з боку Масквы. Тое ж назіралася і ў Югаславіі апошнімі гадамі кіравання Мілошавіча."

Радыё "СВАБОДА"

Газета Слонімская
6 —12 верасня 2001г. №36 (222)

ГАСТРОЛІ

Бабкіна ў Слоніме зарабіла "бабкі"



У панядзелак, 3 верасня, расійская спявачка Надзея Бабкіна выступіла з канцэртам на стадыёне "Дынама" у Слоніме.

Перад тым, як прыехаць у наш горад, спявачка запатрабавала, каб на стадыёне былі пастаўлены чатыры палаткі, а ў іх былі мэбля, посуд, кава "Nescafe" і г.д. Гэтыя ўмовы былі выкананы, а спявачку сустракаў асабіста старшыня Слонімскага гарвыканкама Алег Лакцюшын. Бо ў Мастах, дзе Бабкіна выступала 1 верасня, такой увагі было ўдзелена менш. "Зорка" эстрады сваю незадаволенасць сустрэчай у Мастах выказала па тэлефоне кіраўніцтву Гродзенскага аблвыканкама.

Канцэрт у Слоніме пачаўся ў 18 гадзін. Цэнтральная трыбуна стадыёна была запоўнена гледачамі старэйшага і сярэдняга ўзросту. Праўда, пасля некалькіх песень слонімцы паціху пачалі пакідаць стадыён. Тое самае было і ў Мастах. Але, калі ў Мастах канцэрт Бабкінай быў бясплатны, то слонімцы за квіткі плацілі па 2 тысячы рублёў. Гэта, вядома, нядорага, бо сам канцэрт спявачкі з Расіі ў Слоніме каштаваў 15 мільёнаў рублёў (10 тысяч даляраў), якія прыйшлося пералічыць Бабкінай з мясцовага бюджэту. І калі яна прыехала ў Беларусь "из добрых побуждений к братскому белорусскому народу", дык ці не ганаровей было б выступіць бясплатна, пабрацку. Але падобныя "побуждения" з боку Расіі мы ведаем даўно. Адным словам, Бабкіна ў Слоніме і ў іншых гарадах Беларусі проста зарабляе "бабкі".

Сяргей ЧЫГРЫН

У Слонімскім аддзеле ЗАГС зарэгістравалі шлюб:

Шыдлоўскі Васіль і Скок Юлія
Яліхін Вячаслаў і Катко Іна
Шмялёў Мікалай і Кучынская Таццяна
Яткевіч Віталь і Бічэўская Юлія
Мароз Аляксандр і Якубовіч Марына
Русы Аляксандр і Жыгар Людміла
Пацынка Дзмітрый і Бярэзняцкая Іна
Нікіфараў Віктар і Зіновіч Алена
Сярэдзіч Генадзь і Крот Вольга
Байрачэнка Сяргей і Апанасік Ірына
Анішчык Сяргей і Чылік Наталля
Шкраба Іван і Чарнуха Алена
Рудак Уладзімір і Шлыкава Алена
Іголкін Валерый і Русакевіч Іна
Грыцкевіч Аляксандр і Якубовіч Алеся
Альховік Аляксандр і Сёмуха Іна
Гуляеў Канстанцін і Лях Наталля
Лашчэўскі Віталь і Гурноўская Наталля
Далінскі Віталь і Латош Вольга



У Слонімскім аддзеле ЗАГС зарэгістраваны дзеткі, якія нядаўна нарадзіліся:

Ягораў Даніла
Андрукевіч Дзіма
Макарэвіч Валерыя
Байдэнка Арцём
Паўлючэнка Ілля
Калодка Мікіта
Губарэвіч Іван
Тарасюк Сяргей
Апанасевіч Паліна
Тумашык Вікторыя
Мацяш Раман
Ігнацікі Раман і Руслан
Скок Анатоль
Буйко Алена
Куляшэвіч Сяргей
Каваленка Дыяна
Брайчук Кацярына
Саладуха Крысціна
Кірэй Сяргей
Чайкоўская Ангеліна
Лагуцік Марта
Шлемен Андрэй
Лях Ксенія



Дорогая и любимая
ПЕТЛИЦКАЯ Елена Николаевна!
От всей души поздравляю тебя с 20-летием!

Под звон хрустального бокала,
В кругу всех родных и друзей,
Мы в юбилей тебе желаем
Добра, здоровья, светлых дней.
И чтобы беды, горе и ненастья
Все проходили стороной,
Лишь только радость и счастье
К тебе летели в дом родной.



С любовью Дима

Дорогие
ГУРНОВСКАЯ Наталья и ЛАЩЕВСКИЙ Виталий!
Поздравляем Вас с днём бракосочетания!

Сегодня здесь и в этот час
Судьба соединила Вас,
В жизнь воплотилися мечты,
Друзья, шампанское, цветы...
И здесь под сводами дворца
Надеты были два кольца.



Волшебный росчерк юных рук,
И Вы — супруга и супруг.
Стих Мендельсона чистый звук,
Среди друзей, среди подруг,
Таинства родов не тая,
Родилась новая семья.

С искренними пожеланиями Елена, Анатолий, Тамара

Дорогая подруга
Елена СТАДНИК!
От всей души поздравляю тебя с 18-летием!

Когда приходит день рожденья,
На год становишься взрослей.
В душе и радость, и веселье,
И жизнь становится сложней,
Но годы быстро пролетают,
И их нельзя остановить.
Они нас сильно изменяют,
И ими надо дорожить!



С наилучшими пожеланиями твоя лучшая подруга Наташа Я.

Уважаемая
Нина Алексеевна СЕМЕНЮК!
От всей души поздравляем тебя с юбилеем!

Пусть беды уходят с дороги твоей,
Пусть будет побольше хороших друзей,
Пусть будет всё, что ты хочешь сама.
Любви тебе, веры, поддержки, добра!

С уважением твои одноклассницы: Лысеня и Смирнова

Уважаемый
Александр Степанович ЕРЕМЕЙЧИК!
Горячо и сердечно поздравляем Вас с 40-летним юбилеем.

Итак, настал Ваш День рожденья,
Не просто день, а юбилей.
Примите наши поздравленья
От всех сотрудников, друзей!
Желаем золотого настроенья,
В труде — успехов, долгих лет,
И пусть печали стороной обходят,
Судьба хранит от всяких бед!



Самые искренние пожелания здоровья, счастья, удачи и благополучия в этот знаменательный день!

Коллектив штаба артиллерии

Наши дорогие
**ЛАЩЕВСКАЯ Екатерина Лукинична,
ЗИНЕВИЧ Елена Ивановна,
РАДИШЕВСКАЯ Доротта Сигизмундовна!**
Поздравляем Вас с днём рождения!

Вам желаем в День рожденья
Улыбок, радостных хлопот,
Здоровья, счастья и веселья
Сегодня, завтра, круглый год!

Коллектив комбината бытовых услуг

Дорогая и любимая наша дочь и сестра
ЧАЛОВА Наталья!
От всей души поздравляем тебя с Днём рождения!

Пожелать тебе хочется много:
Чтобы счастье своё ты нашла,
Чтобы длинной была та дорога,
По которой ты в жизни пошла,
Чтобы люди тебя уважали,
И светлее всё было вокруг,
И чтоб рядом с тобой оставался
Хоть один, но надёжный твой друг.



С любовью и уважением мать и брат Игорь

Дорогая и любимая жена, мамочка и бабушка
Любовь Николаевна МУШИНСКАЯ!
Искренне и сердечно поздравляем тебя с юбилеем со дня рождения!
Крепкого здоровья на долгие годы, семейного счастья и благополучия.



